**ЭКАЛОГІЯ**

**Небяспечныя лямпы**

***Работнік ААТ «Бялынічы» атрымаў штраф 10 бв за невыкананне мер па забеспячэнні збору адходаў і іх падзелу па відах.***

Падчас праверкі інспекцыяй ПРіАНА было зафіксавана правапарушэнне на тэрыторыі МТК «Вялікі Трылесін», які належыць указанаму вышэй таварыству. У кантэйнеры для збору змешаных адходаў, што падлягаюць пахаванню, а таксама ў электрашчытавым памяшканні захоўваліся люмінесцэнтныя адпрацаваныя лямпы ў выглядзе трубак.

Як адзначыў начальнік райінспекцыі ПРіАНА Юрый СІМАНАЎ, за парушэнне патрабаванняў пп. 1.1, 1.2 п. 1 арт 17 і п. 1 арт 25 Закона «Аб абыходжанні з адходамі», адказны за ўтылізацыю адходаў, супрацоўнік ААТ «Бялынічы» атрымаў штраф у памеры 290 руб.

**Аліна ЦЫГАНІЙ.**

**Фота аўтара.**



**фото: лампочки**

***Незаконнае захоўванне люмінесцэнтных адпрацаваных лямп нясе адчувальную шкоду навакольнаму асяроддзю.***